*Бусел чорны* (мал. ф-32) мае пераважна чорную афарбоўку. У адрозненне ад белага, ён вельмі асцярожны і пазбягае суседства з чалавекам. Гняздуецца звычайна ў старых вільготных лясах, побач з балотамі. Корміцца воднымі жывёламі, яшчаркамі, змеямі і дробнымі грызунамі. Бусел чорны ўключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

**Паўторым галоўнае.** Драпежныя птушкі падзяляюцца на дзённых і начных. Драпежных птушак адрозніваюць востры зрок, моцная загнутая дзюба, моцныя заднія канечнасці з вострымі доўгімі кіпцюрамі. Побач з жыллём чалавека пасяляюцца сінантропныя птушкі. Яны прыстасоўваюцца да ўмоў, створаных або відазмененых дзейнасцю чалавека.

**Пытанні і заданні.** **1.** Якіх птушак называюць драпежнымі? Прывядзіце прыклады дзённых і начных драпежных птушак. **2.** Па якіх прыметах дзённую драпежную птушку можна адрозніць ад начной? **3.** Чым адрозніваюцца сінантропныя птушкі ад драпежных? **4.** Чаму адны птушкі гняздуюцца калоніямі, а іншыя жывуць парамі? Прывядзіце прыклады такіх птушак.

**Біялагічныя рэкорды**

- Самая маленькая птушка Беларусі — *каралёк жоўтагаловы*. Яго маса складае ад 4 да 8 г, даўжыня цела не перавышае 10 см.
- Самая вялікая птушка Беларусі — *лебедзь-шыпун*. Маса самцоў можа дасягаць 13 кг, даўжыня цела — 2 м.
- Самая вялікая драпежная птушка Беларусі — *арлан-белахвост* (мал. 166 на с. 185). Маса цела дарослай асобіны можа дасягаць 6,5 кг, даўжыня — 95 см, размах крылаў — 2,5 м.

## § 48. Роля птушак у прыродзе і значэнне ў жыцці чалавека. Ахова птушак

**Успомніце:** **1.** Якія экасістэмы, заселеныя птушкамі, вам вядомыя? **2.** Якія птушкі з'яўляюцца выключна насякомаеднымі?

**Роля ў прыродзе.** Птушкі з'яўляюцца важным звяном у ланцугах харчавання. Яны спажываюць разнастайны корм расліннага і жывёльнага паходжання і самі служаць кормам для іншых драпежных жывёл. Драпежныя птушкі, ловячы аслабленых і хворых жывёл або паядаючы ўжо мёртвых, выконваюць ролю санітараў у прыродзе.

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Знішчаючы насякомых — шкоднікаў раслін, іх лічынак, а таксама грызуноў, — птушкі абараняюць палі, лугі, лясы. Паядаючы плады і насенне, птушкі спрыяюць распаўсюджванню раслін на вялікія адлегласці.

*Сойкі*, кормячыся жалудамі, часта губляюць іх у палёце, у выніку чаго жалуды апынаюцца далёка ад дуба і там прарастаюць.

*Пячураўкі, крапіўнікі, каралькі* за суткі з'ядаюць насякомых у два разы больш, чым важаць.

**Значэнне ў жыцці чалавека.** Чалавек выкарыстоўвае птушак у розных мэтах: для спажывы (мяса, яйкі), як сыравіну для вытворчасці розных вырабаў (пуховыя курткі, паліто, падушкі, коўдры) або ўгнаення (птушыны памёт).

На некаторых птушак (напрыклад, дзікіх качак, гусей, арабкоў) можна паляваць.

Дэкаратыўных (папугаі) і пеўчых (канарэйкі) птушак чалавек трымае дома, каб назіраць за іх паводзінамі або атрымліваць эстэтычную асалоду ад знешняга выгляду і спеваў.

Важнае значэнне ў жыцці чалавека маюць *куры* (мал. 170), *гусі* (мал. 171), *качкі* (мал. 172), *індычкі* (мал. 173), *перапёлкі* (мал. 174).



**Мал. 170.** Развядзенне курэй



**Мал. 171.** Гусі на вольным выпасе



**Мал. 172.** Качкі на хатнім двары



**Мал. 173.** Індычкі на хатнім двары



**Мал. 174.** Развядзенне перапёлак

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

У цяперашні час развядзенне гэтых птушак пастаўлена на прамысловую аснову. Асноўныя кірункі дзейнасці птушкафабрык нашай краіны — развядзенне курэй, вытворчасць яек і курынага мяса.

На птушкафабрыках курэй гадуюць у абсталяваных памяшканнях, дзе аўтаматычна рэгулююцца тэмпература, вільготнасць, склад паветра, працягласць дня і ночы. Зімой штучнае асвятленне павялічвае светлы час сутак і стымулюе квактух несці яйкі.

Птушанят выводзяць без удзелу нясушак, у спецыяльных аўтаматызаваных апаратах — інкубатарах, дзе падтрымліваюцца пэўныя тэмпература і вільготнасць.

Інкубатар складаецца з дзвюх камер. У першай, больш буйной, знаходзяцца латкі з яйкамі. Кожныя дзве гадзіны яйкі аўтаматычна пераварочваюцца, каб зародкі не загінулі. За пару дзён да канца інкубацыі латкі з яйкамі пераносяць у другую камеру — вывадкавую, дзе вылупліваюцца птушаняты.

**Ахова птушак.** Для аховы птушак у нашай краіне праводзіцца шэраг мерапрыемстваў. Гэта, у першую чаргу, забарона палявання на прамысловых птушак у перыяд размнажэння і ліњкі, забарона на выкарыстанне браканьерскіх спосабаў і прылад лоўлі птушак. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь існуюць заказнікі, дзе нельга паляваць на птушак. Хворых асобін лечаць і рэабілітуюць, а пасля выпускаюць у асяроддзе іх пражывання. Тых птушак, якія па розных прычынах не могуць вярнуцца ў натуральныя ўмовы, пакідаюць на ўтрыманні да канца іх жыцця. Для прываблівання птушак у садах і парках развешваюць штучныя гняздоўі (напрыклад, шпакоўні) і кармушкі.

**Паўторым галоўнае.** Птушкі з'яўляюцца звёнамі ланцугоў харчавання, санітарамі прыроды і спрыяюць распаўсюджванню раслін на вялікія адлегласці. Чалавек выкарыстоўвае птушак у розных мэтах: для спажывання, як сыравіну для вытворчасці розных вырабаў, угнаенняў. У нашай краіне аддаецца вялікая ўвага ахове птушак.

**Пытанні і заданні.** **1.** Якую ролю выконваюць птушкі ў прыродзе? **2.** Якое значэнне маюць птушкі ў жыцці чалавека? **3.** Назавіце птушак, якіх у прамысловых маштабах разводзяць у Беларусі. **4.** Як чалавек можа дапамагчы птушкам? **5.** Якіх птушак і з якой мэтай прыручыў чалавек? **6.** Для праверкі ведаў па § 41–48 выканайце тэставае заданне.

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

## ПАДВЯДЗЁМ ВЫНІКІ

| **Асноўныя прыметы *класа Птушкі*** | |
|---|---|
| **Прадстаўнік** | *Голуб шызы* |
| **Асяроддзе пражывання** | Наземна-паветранае |
| **Асаблівасці знешняй будовы** | Цела абцякальнай формы. Складаецца з галавы, шыі, тулава, пярэдніх канечнасцей (крылаў) і задніх канечнасцей. Ёсць дзюба, доўгая рухомая шыя |
| **Покрывы цела** | Скура тонкая і сухая, пакрыта пёрамі |
| **Шкілет** | Касцявы, трывалы і лёгкі. Уключае: чэрап, пазваночнік і грудную клетку, шкілет пярэдніх канечнасцей (косці плечавога пояса і косці свабодных пярэдніх канечнасцей) і шкілет задніх канечнасцей (косці тазавага пояса і косці свабодных задніх канечнасцей). Пазваночнік: шыйны, грудны, паяснічны, крыжавы і хваставы аддзелы. Грудзіна мае кіль |
| **Мышачная сістэма** | Самыя буйныя мышцы — грудныя. Развіты падскурныя мышцы і мышцы задніх канечнасцей |
| **Стрававальная сістэма** | Пярэдні аддзел (рот, глотка, стрававод, валляк, страўнік), тонкая кішка, тоўстая кішка. Страўнік складаецца з двух аддзелаў: залозістага і мускульнага. Ёсць слінныя залозы, печань, падстраўнікавая залоза, клаака |
| **Дыхальная сістэма** | Дыхальныя шляхі (насавая поласць, гартань, трахея, бронхі). Вырасты бронхаў — паветраныя мяшкі. Губчатыя лёгкія. Двайное дыханне |
| **Крываносная сістэма** | Замкнёная. Чатырохкамернае сэрца: два перадсэрдзі і два жалудачкі. Два кругі кровазвароту. Цеплакроўныя |
| **Нервовая сістэма** | Галаўны і спінны мозг (цэнтральная нервовая сістэма) і нервы, якія адыходзяць ад галаўнога мозга і спіннога мозгу да ўсіх органаў. Галаўны мозг: пярэдні мозг, прамежкавы мозг, сярэдні мозг, мазжачок, прадаўгаваты мозг. Сфарміравана кара галаўнога мозга. Развіты мазжачок |
| **Органы пачуццяў** | Орган зроку — вочы. Добра бачаць прадметы на розных адлегласцях. Здольны адрозніваць колер. Орган слыху — унутранае вуха, сярэдняе вуха і элементы знешняга вуха (знешні слыхавы праход). Нюх развіты слаба |
| **Выдзяляльная сістэма** | Пара тазавых нырак. Мачавы пузыр адсутнічае |
| **Палавая сістэма** | Раздзельнаполыя. У самак ёсць адзін (левы) яечнік. Апладненне ўнутранае. Развіццё прамое |

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»